УДК 008:378.14

**В.А. Вараб'ёва,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ;*
**Т.Ф. Сухоцкая,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ*

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ У СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ

Пераадоленне крызіснага стану сучаснай цывілізацыі ў значнай ступені залежыць ад гуманітарызацыі адукацыі, ад фарміравання на аснове яе суб'екта сацыяльнага і культурнага жыццядзеяння. У змесце вышэйшай і сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь на сучасны момант прэваліруе арыентацыя на стандартызаваныя формы ацэнкі ведаў (тэсціраванне) і камп'ютэрызацыю вучэбнага працэсу, што негатыўна ўплывае на развіццё культуры маўлення, навыкаў выказвання, на раскрыццё творчага патэнцыялу асобы, крэатыўнасці. Праблема фарміравання творча актыўнай асобы пастаўлена ў цэнтр увагі культуралагічнай падрыхтоўкі ў ВНУ. Асаблівае месца яна займае ў сістэме падрыхтоўкі настаўніка.

З 1999 г. у БДПУ для студэнтаў І курса факультэта народнай культуры, а з 2004 г. і для студэнтаў факультэта беларускай філалогіі і культуры ўведзена новая дысцыпліна – культуралагічны практыкум. Яна прадугледжвае падрыхтоўку будучага настаўніка да ўкаранення ў школьнае жыццё нормы «культура на штодзень».

Метадалагічнай асновай новага курса сталі прынцыпы універсалізму, халізму, культуразгоднасці, адзінства номатэтычнага і ідэаграфічнага падыходаў. Рэалізацыя названых прынцыпаў дае магчымасць пазнаваць не толькі асобныя артэфакты нацыянальнай культуры, але і перайсці ад вывучэння культуры да спасціжэння яе на ўзроўні мадэлі, што садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў культурна дэтэрмінаваных псіхічных комплексаў і цэласнага ўяўлення пра культурную прастору.

*Мэта курса* – практычнае авалоданне навыкамі сістэматызацыі артэфактаў культурнай прасторы, вербалізацыі практычнай дзейнасці.

У працэсе выкладання курса вырашаюцца наступныя *задачы:* авалодванне навыкамі граматнага аналізу экскурсій і іх самастойнага правядзення; фарміраванне моўнай культуры студэнтаў (пісьмовыя водзывы, рэцэнзіі і інш. і вусныя выказванні); авалодванне методыкай падрыхтоўкі і правядзення творчых сустрэч, літаратурных вечарын, прэзентацый; авалодванне методыкай індывідуальнай і калектыўнай працы.

У адпаведнасці з задачамі вылучаны асноўныя *блокі практыкуму:* 1) экскурсіі; 2) музеі; 3) тэатры; 4) творчыя сустрэчы; 5) прэзентацыі.

Змест курса ў межах кожнага блока прадугледжвае правядзенне аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў, а таксама самастойную працу студэнтаў. На аўдыторных занятках павінны быць засвоены асноўныя тэарэтычныя палажэнні культуралогіі, без якіх немагчыма практычнае асэнсаванне артэфактаў. Напрыклад, наведванню музеяў папярэднічае азнаямленне з відамі музеяў, гісторыяй іх узнікнення, вызначэнне месца, ролі музеяў у фарміраванні асобы. Пасля такой падрыхтоўчай работы ў іншым ракурсе паўстае экспазіцыя любога з музеяў. У аўдыторыях падводзяцца вынікі наведвання музеяў, удзелу ў экскурсіях і іх правядзення, знаёмства з гісторыка-культурнымі запаведнікамі, а таксама творчыя сустрэчы. Яны праходзяць у форме круглых сталоў, дыспутаў з выкарыстаннем ілюстрацыйных і фотаматэрыялаў. Удзел у абмеркаванні і вербальнае афармленне ўласных уражанняў і вывадаў з'яўляецца абавязковым патрабаваннем праграмы. У працэсе абмеркавання праблемы фарміруецца ўменне ацэнкі зместу, засвойваецца методыка правядзення мерапрыемства.

Самастойная праца прадугледжвае збор і сістэматызацыю фактычнага матэрыялу, яго афармленне з улікам метадычных рэкамендацый. Развіццю самастойнасці мыслення, лагічнасці выкладак, аргументаванасці садзейнічаюць пісьмовыя работы. У працэсе правядзення заняткаў вялікая ўвага надаецца такім жанрам, як водзывы, рэцэнзіі, эсэ. Практыкай пацверджана, што найбольш дзейсную функцыю выконваюць тэмы, у распрацоўцы якіх актыўна ўдзельнічаюць навучэнцы:

1. «Нам засталася спадчына...» (культурныя сэнсы беларускай матэрыяльнай культуры на матэрыялах музея народнай архітэктуры і побыту).

2. Думкі на руінах старога замка (па матэрыялах экскурсій у Мір, Нясвіж, Крэва, Гальшаны).

Праводзяцца са студэнтамі і групавыя формы работы. Тэматычныя экскурсіі «Культавая архітэктура Мінска», «Літаратурныя мясціны Мінска» распрацоўваюцца невялікімі групамі студэнтаў, што садзейнічае іх згуртаванасці, а таксама павышае агульны метадычны ўзровень. Групавая форма работы з'яўляецца найбольш дзейснай і ў правядзенні прэзентацыі кнігі. Прэ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

зентацыя ўключае наступныя *блокі:* звесткі пра аўтара; тэма і ідэя кнігі; выданне і іх лёс; афармленне выданняў (кніжная графіка); сцэнічнае афармленне прэзентацыі (сцэнарый, святло, касцюмы, музыка).

Абавязкі ў малой групе размяркоўваюцца самімі ўдзельнікамі. Яны ж выбіраюць рэжысёра, які кіруе працэсам падрыхтоўкі і правядзеннем прэзентацыі. Любая дзейнасць студэнтаў (індывідуальная і калектыўная) абавязкова павінна заканчвацца аналізам і ацэнкай. Выяўленне поспехаў і недахопаў, крытычны погляд на сваю працу фарміруе адказнасць і садзейнічае паглыбленню творчага патэнцыялу студэнтаў.

Курс «Культуралагічны практыкум» з'яўляецца неабходным для падрыхтоўкі настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка. Ён дае магчымасць назапашвання фактычнага матэрыялу для пазакласнай работы, узбагачае ўласным вопытам правядзення пазакласных мерапрыемстваў, знаёміць з іх методыкай, што павышае прафесійны ўзровень настаўніка, класнага кіраўніка.

Summary

*The problem a creative personality of formation of a future teacher is considered in this article. A new academic discipline «Culturological practical training», its methodology, content and training technique are analysed. Some requirements and useful recommendations are given.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ